

# Гісторыя вёскі Сабакінцы або Ад Забалоцця да Першамайскай

*аг.Першамайск*

***Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь***
***Упраўленне адукацыі Гродзенскага аблвыканкама***
***Аддзел адукацыі Шчучынскага райвыканкама***
***ДУА "Шчучынская раённая база юных турыстаў"***

# Таямніцы малой радзімы

# Гісторыя вёскі Сабакінцы або Ад Забалоцця да Першамайскай

***Намінацыя: "Паданні"***

***Аўтары-складальнікі:*** *удзельнікі гуртка "Юны краязнавец"*

***Кіраўнік: Гудач Наталля Іосіфаўна,*** *настаўніца гісторыі Першамайскага дзіцячага сада-сярэдняй школы*
***Дызайн і вёрстка: Гудач Н.І.***

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*"Навучальна-педагагічны комплекс*
*"Першамайскі дзіцячы сад –*
*сярэдняя школа"*
*231544 вул. .Школьная,1, аг.Першамайск,*
*Шчучынскі раён, Гродзенская вобласць*

***тэл. 8(01514) 35321 e-mail:*** *perwom@mail.ru.*

***Краязнаўства з'яўляецца важным педагагічным сродкам патрыятычнага, духоўнага, працоўнага і эстэтычнага выхавання. У летапісе населенага пункта паказана сувязь школьнікаў з жыццём роднага края, з яго мастацкай і духоўнай культурай і з людзьмі. Краязнаўства садзейнічае далучэнню моладзі да пошукава-даследчай дзейнасці, творчасці, самастойнасці, пашырае магчымасці актыўнай прапаганды ведаў па гісторыі роднага краю і асаблівасцях яго сучаснага жыцця.***



**ТЫ НАШ КРАЙ. ТЫ ЧЫРВОНАЯ ГРУША**
**НАД ДЗЕДАЎСКІМ ДОМАМ,**
**ЛІСТАПАДАЎСКІХ ЗНІЧАК ГУСТЫХ**
**ФАСФАРЫЧНАЯ РАЦЬ,**
**ТЫ - НАШ СЦЯГ, ШТО НІКОМУ, НІКОМУ НА**
**СВЕЦЕ, НІКОМУ**
**НЕ ДАМО АБСМЯЯЦЬ, АПАГАНІЦЬ,**
**ЗАБЫЦЬ, ЦІ МЯЧОМ ЗВАЯВАЦЬ.**
**МЫ КЛЯНЁМСЯ ТАБЕ БАРАЗНОЙ СВАЁЙ**
**ПЕРШАЙ НА ПОЛІ**
**І АПОШНЯЙ РАЛЛЁЙ, НА ЯКУЮ ЎПАДЗЕМ**
**У ЖУРБЕ.**
**МЫ КЛЯНЁМСЯ ТАБЕ, ШТО НІКОЛІ,**
**НІКОЛІ, НІКОЛІ,**
**ТАК, НІКОЛІ НЕ КІНЕМ, НЕ КІНЕМ, НЕ**
**КІНЕМ ЦЯБЕ.**



*“Каб зразумець сябе сапраўдным чалавекам,*
*уявіць прыналежнасць да свайго роднага,*

***беларускага, славянскага, разумець сваё месца ў свеце, неабходна вывучаць народныя каштоўнасці, тое, што стагоддзямі стваралі, выкарыстоўвалі і захоўвалі нашы продкі".***

*Калі гэту зямлю ўбачыш хоць раз у жыцці – не забудзеш. Калі з чыстых яе крыніц вып'еш глыток вады – прыбавіцца сіл і радасці. Калі пройдзеш па гэтай зямлі – палюбіш яе.*

*А калі нарадзіўся на гэтай зямлі, то дзе б не апынуўся, сэрца будзе неадступна клікаць да лясных і азёрных даляў, да духмянага чабору на ўзгорку ды жытнёвага поля. Будзеш бачыць родную зямлю то цяжкім коласам, то сенажаццю, то бульбай, спечанай у попеле вогнішча, заўсёды будзеш чуць яе песні – сумныя, вясёлыя, жаўрукова-радасныя, з маленства і на ўсё жыццё – родныя.*

*Населенныя пункты зямлі беларускай… Яны, як і людзі. У кожнага свой непаўторны твар, свой жыццёвы лёс, свае здабыткі. Адны славяцца старажытным мінулым, выключнай роляй у канкрэтных гістарычных падзеях. Другія – архітэктурнымі помнікамі, прыгажосцю сучасных збудаванняў. Трэція – дасягненнямі ў эканамічным развіцці, маладосцю…*

*Прыйдуць людзі….*
*І спытаюць Нас.*

*“Скуль, якога Вы роду?*
*Дзе зямля ваша будзе,*
*Дзе Айчына ў Вас?”*

*Вёскі і вёсачкі, гарады і гарадкі, рэчкі і рачулкі… Вялікія кропкі і маленькія жылкі на карце нашай Беларусі. За імі – гісторыя і лёсы канкрэтных населеных пунктаў, якія багаты на падзеі, людзей і назвы. Назвы як адлюстраванне сутнасці існавання і гісторыі развіцця сапраўдны скарб для тых, хто хоча ўсё ведаць пра сваю малую радзіму.*

*Гісторыя назвы нашага населенага пункта ў многім унікальная. Але аб усім па парадку.*

*Паводле вядомага гісторыка і краязнаўцы Н.Роўбы сучасная вёска Першамайская вядома з XV ст. Гісторыя ўзнікнення яе назваў ўяўляе сабой непаўторную траекторыю руху ад назвы Забалацце да Першамайскай.*

*Першапачатковая назва нашай вёскі была Забалацце. Назва добра адлюстроўвала прыродныя асаблівасці гэтай мясцовасці, але стварыла путаніцу. Справа ў тым, што ў дзесяці кіламетрах ад вёскі размяшчалася мястэчка Забалаць (вёска ў сучасным Воранаўскім раёне). Гэтаму спрыялі і падзеі, якія скаліся ў вёсцы. У 1550 годзе в. Забалацце была перададзена перабежчыку з Масквы баярыну Міхаілу Сабакіну, то, мясцовае паселішча сталі называць вёскай Сабакінцы. Як было на самай справе, пэўна,*

*дакладна ніхто не ведае, але пад назвай Сабакінцы вёска праіснавала больш за 300 гадоў, нават некаторы час лічылася мястэчкам.*

*У другой палове XVIII ст. грубая мужыцкая назва Сабакінцы не стала ўспрымацца шляхтай, так як на іх паўздзейнічала захапленне антычнай культурай і французскае асветніцтва. Каб надаць Сабакінцам больш ласкавую назву шляхта пачала выкарыстоўваць новую форму – Сабокінцы. Але сяляне не разумелі польскай мілагучнасціі і выкарыстоўвалі былую назву Сабакінцы.*

*У 60-я гады XIX ст. з боку праваслаўных свяшчэннікаў з'явілася прапанова пераіменаваць Сабокінцы ў сяло Пакроўскае ці проста Пакровы (старая назва мясцовай царквы пакровы Прысвятой Багародзіцы). Гэта прапанова абмяркоўвалася амаль 30 гадоў, пад час якіх мястэчка называлася ці Пакроўскім, ці Сабокінцамі. У верасні 1899 года губернскае праўленне ў Вільні канчаткова замацавала новую назву – Пакроўскае.*

*Не паспела паселішча прывыкнуць да новай назвы, як пачаліся войны, рэвалюцыі ды паўстанні 1914 – 1920-х гадоў, у выніку якіх Шчучыншчына стала часткай Польскай дзяржавы. Навыя ўлады адразу адмовіліся ад назвы Пакроўская і вярнуліся да старой назвы Сабокінцы.*

*Але ў хуткім часе польскім уладам таксама не спадабалася назва Сабокінцы, і ў сярэдзіне 30-х гадоў XX ст. з'явіўся праект пераіменаваць Сабокінцы ў Нарбутова – у гонар аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гадоў Людвіга Нарбута.*

*2 ліпеня 1939 года адбылося ўрачыстае свята ў гонар прысваення мястэчку новай назвы – Нарбутова. Не паспела высахнуць фарба на свежых шыльдах, як у верасні 1939 года пачалася Другая сусветная вайна, першай ахвырай якой стала Польшча. Не прабыўшы і трох месяцаў назва Нарбутова зноў была пераіменавана ў Сабакінцы.*

*Пад такой назвай населенны пункт перажыў цяжкія ваенныя гады і быў вызвалены савецкімі войскамі 12 ліпеня 1944 года.*

*У 1944 годзе на Шчучыншчыну канчаткова прыйшла Савецкая ўлада. На пачатку 1950-ых гадоў, пасля аднаўлення гаспадаркі, калектывізацыі і знішчэння так званых "бандаў", новае кіраўніцтва звярнула ўвагу на нязручную назву аднаго з раённых сельскіх Саветаў – Сабакінскі. Каб неадкладна вырашыць гэтае пытанне ў 1954 г. вёску Сабакінцы пераіменавалі ў Першамайскую, а мясцовы сельскі Савет стаў Першамайскім. Новыя назвы былі мелагучнымі і яскрава савецкімі.*

*Так па сённяшні дзень існуе добра ўсім вядомая вёска Першамайская.*

*Такім чынам, на працягу сваёй 500 – гадовай гісторыі сучасная вёска Першамайская змяніла 6 назваў:*

*Забалацце*
*Сабакінцы*
*Собокінцы*
*Пакроўскае*
*Нарбутова*
*Першамайская*

*Няхай ведаюць нашых!*

## *З гісторыі роднай вёскі (паданні)*

*Першамайск. Сапраўды, ці з прадвеку называлі так прыгожую вёску на Шчучыншчыне. Не. Да гэтага наша вёска мела шмат цікавых назваў. Існуе некалькі паданняў, якія тлумачаць паходжанне нашай вёскі пад назвай Сабакінцы:*

*1. За паспяховуі і добрую службу у баі з Паўднёва-Усходнімі плямёнамі гэтыя месцы, дзе былі лясы падараваны царом падпалкоўніку па прозвішчы Сабакін. І ў 1450 годзе падпалкоўнік, у якога быў маёнтак яшчэ дзесьці ў цэнтры Расіі, прыехаў у гэтыя мясціны для агляду мясцовасці. На месцы Першамайска была невялікая, але вельмі прыгожая дубовая мясцовасць. Ён вырашыў паставіць хаціну для прыезду на паляванне. Для атрымання такой пабудовы падпалкоўнік пасяліў тут сваю сям'ю, назваў гэту мясціну ад свайго прозвішча Сабакіна. З*

1450 года стала пабольшваццa насельніцтва. (гэтыя звесткі ўзяты з часопіса “Зямля”)

Другое паданне тлумачыць назву вёскі так:

Там, дзе цяпер бальніца жыла пані, якая мела псарню каля ста сабак. Сабакі кідаліся на людзей, і пагэтаму вёску назвалі Сабакінцамі.

А вось і трэці варыянт: За тое, што жыхары выступілі супраць царызму, царскі генерал Мураўёў загадаў назваць вёску Сабакінцамі, ад слова сабака.

2. Другая назва вёскі Пакроўка тлумачыцца так:

У цэнтры вёскі знаходзілася Пакроўсккя царква, якая была названа ў гонар свята “Пакрова”. Ад гэтага вёска была названа Пакроўскай.

3. Трэцяя назва вёскі Нарбутова:

У час паўстання 1863-1864 гг. кіраўніком паўстанчага атрада на нашай мясцовасці быў Людвіг Нарбут. У яго гонар вёска была названа Нарбутова. Гэтыя зведкі былі атрыманы ад вясковых старажылаў.

З 1954 г. вёска атрымала назву Першамайская, у гонар свята Першага Мая. Так завецца яна і сёння.

З усіх назваў найбольш часцей выкарыстоўваецца назва Сабакінцы. І сёння гэта слова знаходзіцца ў актыўным ужытку людзей розных узростаў і разнастайных сацыяльных груп.

# “Першамайск любімы”

*Першамайск любімы, майму сэрцу мілы,*
*Зноў ты нарадзіўся і няспынна рос.*
*Прыгажэў з гадамі.ю набіраўся сілы*
*І высока ўзняўся ў сіняву нябёс.*

*І тваёй красою кожны ганарыцца*
*Дарагі народу новы воблік твой.*
*Расцвітай жа наша, дарагая вёска,*
*Будзем ганарыцца мы заўжды табой.*

*Аўтар верша: Антухевіч Наталля*

*1992 г.*

